Найвялікшы ўклад у справу беларускага Адраджэння ў Латвіі з 1921 па 1944 г. унёс ураджэнец Дзвінску (Даўгапілсу) былы сябра Урада Беларускай

Народнай Рэспублікі, вайсковы і палітычны дзеяч, педагог, публіцыст і паэт Кастусь Езавітаў. Ён са сваімі паплечнікамі, прадстаўнікамі свядомай беларускай інтэлігенцыі С.Сахаравым, У.Пігулеўскім, С.Сіцько, П.Мірановічам, Э.Вайвадзішам і іншымі беларусамі пад гістарычнымі беларускімі сімваламі бел-чырвона-белым сцягам і гербам Пагоняй адраджалі і абаранялі беларускую мову, культуру, гісторыю і асвету беларускай дыяспары ў Латвіі.



Latvijas izglītības ministrijas Baltkrievu nodaļa.
Pirmajā rindā Sergejs Saharovs un Kastuss Jezavitavs.
Беларускі аддзел школаў
Міністэрства адукацыі Латвіі.
У першым радзе злева С. Сахараў. і К.Езавітаў.

Вялікую дапамогу беларусам Латвіі аказаў Яніс Райніс. Дзякуючы падтрымцы класіка латышскай літаратуры, у 1921 г. пры Міністэрстве асветы ЛР быў створаны Беларускі аддзел, які займаўся арганізацыяй беларускіх школаў у Латвіі.

З прыходам у 1940 г. у Латвію савецкай улады нацыянальнае адраджэнне беларусаў было спынена. У пасляваенны час і найбольш з 1959 і да 1989 г. беларуская дыяспара колькасна павялічылася за кошт маладых спецыялістаў, рабочых і беларусаў-вайскоўцаў, якія прыязджалі ў Латвію. Аднак нацыянальная культурна-асветніцкая дзейнасць беларусамі Латвіі ў той час была спынена, бо яна не адпавядала савецкай ідэалогіі.

У канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя, у часы латвійскай Атмоды, дэмакратычна настроеная беларуская інтэлігенцыя Рыгі стала ў адзіныя шэрагі з латышамі і прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў, каб разам аднаўляць незалежную латвійскую дзяржаву і сваю нацыянальную культуру. Кіруючыся ідэаламі сваіх папярэднікаў Кастуся Езавітава і яго паплечнікаў, яна стварыла ініцыятыўную групу па арганізацыі беларускага культурнага таварыства, якое павінна было працягваць адраджэнскую культурна-асветніцкую справу беларускага таварыства "Бацькаўшчына".

27 лістапада 1988 г. у Доме культуры прафсаюзаў (Маза Гілдэ) на вул.Амату, 5 у Зялёнай зале ініцыятыўная група сабрала ўстаноўчы сход, на якім было заснавана першае дэмакратычнае Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак". Першым яго кіраўніком быў абраны адзін з сябраў гэтай групы, супрацоўнік Латвійскай акадэміі медыцынскіх навук Сяргей Кузняцоў, а яго першым намеснікам – мастак Вячка Целеш, выпускнік Латвійскай акадэміі мастацтваў.

Вялікую дапамогу ў арганізацыі таварыства аказала прадстаўніца Народнага Фронту Латвіі журналістка Айя Лацэ. Стаяў ля вытокаў заснавання таварыства і быў адным з ініцыятараў яго стварэння вядомы беларускі паэт і публіцыст з Мінску Сяргей Панізнік. Ён у той час часта наведваў Рыгу і быў адным з першых сябраў "Сьвітанка".

Асноўнымі мэтамі, якія вызначыла таварыства, былі: адраджэнне і папулярызацыя беларускай мовы, выхаванне ў суродзічаў нацыянальнай самасвядомасці, а таксама ўзаемазбліжэнне беларускай культуры з латышскай і іншымі нацыянальнымі культурамі Латвіі для большага ўзаемаразумення і



Uz Rīgas pils torņa ar baltkrievu karogu Andris Frīdbergs un Vladimirs Usiks. 1990.g. Atmoda.

На вежы Рыжскага замка з беларускім сцягам А. Фрыдбергс і У. Усік. Атмода.1990 г.

згоды ў грамадстве.

Галоўнымі задачамі "Сьвітанка" сталі: адкрыццё беларускай школы, дзіцячай мастацкай студыі, заснаванне бібліятэкі, ансамбля беларускай песні і выданне беларускай прэсы. Для рэалізацыі гэтых планаў патрэбен быў час і вялікія высілкі не толькі сябраў "Сьвітанка", але і тых, хто хацеў адчуваць сябе беларусам у Латвіі.

З часу з'яўлення "Сьвітанка" прайшло 15 год. За гэты час таварыствам зроблена шмат добрых спраў, дзякуючы самаахвярнай патрыятычнай грамадскай дзейнасці яго сяброў. Цяпер можна азірнуцца назад, каб убачыць плён гэтай працы.

Вельмі актыўная дзейнасць "Сьвітанка" адбывалася ў часы Атмоды ў канцы 80-х і ў пачатку 90-х гадоў дваццатага стагоддзя, калі і ў Беларусі ішло Адраджэнне, узнятае Беларускім Народным Фронтам. Ідэі, якія адстойваў БНФ, -- незалежнасць, дэмакратыя, абарона і адраджэнне роднай мовы, нацыянальнай культуры, гісторыі і асветы на беларускай мове, былі і ідэямі "Сьвітанка". Таму таварыства падтрымала БНФ і ва Ўстаноўчым яго з'ездзе ў Вільні ў 1989 годзе ўдзельнічалі старшыня "Сьвітанка" Сяргей Кузняцоў і Уладзімір Усік, сябра "Сьвітанка" і Народнага Фронту Латвіі.

У 1991 годзе Беларусь атрымала незалежнасць. Пад гістарычнымі сімваламі народа да 1994 г. працягвалася ў краіне беларускае Адраджэнне, якое ўплывала і на латвійскіх беларусаў, на іх удзел у культурна-асветніцкім жыцці дыяспары, на іх адносіны да беларускай і латвійскай дзяржаў. Тады ж беларусы дэмакратычных поглядаў, патрыёты Бацькаўшчыны і Латвіі гуртаваліся каля "Сьвітанка". Таварыства падтрымала незалежнасць гэтых дзяржаў, іх гістарычныя дзяржаўныя сімвалы і статус адзінай дзяржаўнай беларускай мовы ў Беларусі і латышскай – у Латвіі. Менавіта тады з'явілася магчымасць мець добрыя сувязі з Бацькаўшчынай, на яе матэрыяльную і духоўную падтрымку, на сустрэчы ў латвійскім "Сьвітанку" і ў Беларусі з прадстаўнікамі дзяржаўных уладаў, з дзеячамі навукі, культуры, палітыкамі і творчай інтэлігенцыяй Беларусі. Гэта давала плён у працы "Сьвітанка".

## БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА

У 1989 г. у Маза Гілдэ, дзе месцілася таварыства, у памяшканні народнай мастацкай студыі "Гілдэ" таварыствам "Сьвітанак" была адчынена Беларуская мастацкая студыя "Вясёлка", у якой вучылася больш за сорак беларускіх дзяцей з Рыгі, Юрмалы, Огрэ і Олайне. Студыя ў той час матэрыяльна падтрымлівалася латвійскай дзяржавай, а пазней – бацькамі вучняў. "Вясёлка" і зараз працуе ў Рыжскай беларускай асноўнай школе на вул. Ак. Келдыша пад кіраўніцтвам педагога Вячаслава Целеша.




Studijas "Vjasjolka" 5-gade. 1994.g.
5-годдзе студыі "Вясёлка". 1994 г.

Ак. Келдыша пад кіраўніцтвам педагога Вячаслава Целеша.

У 1991 г. у памяшканні "Маза Гілдэ" з вучняў Беларускай мастацкай студыі "Вяселка" была арганізавана і пачала працаваць Рыжская беларуская нядзельная школа. У 1992 г. пры 15-й Рыжскай сярэдняй школе на вул. Вісвалжа, 9 яна была афіцыйна адчынена "Сьвітанкам" і Рыжскай Латгальскай управай школ.

Беларускую мову і літаратуру ў нядзельнай школе з часу яе існавання і да сённяшняга часу выкладалі настаўнікі, сябры "Сьвітанка" Людміла Якаўлева, Таццяна Касуха, Тамара Станкевіч, Ганна Іванэ. Кіраўніком школы стаў Вячка Целеш, які выкладаў таксама асновы гісторыі і культуры Беларусі. За час працы школы адбылося 6 выпускаў. Выпускнікі Рыжскай беларускай нядзельнай школы атрымалі магчымасць вучыцца далей у сярэдне-спецыяльных і вышэйшых навучальных установах Беларусі і Латвіі.

У 1993 г. пры 15-й Рыжскай сярэдняй школе намаганнямі "Сьвітанка" была адчынена падрыхтоўчая група, а з 1-га верасня 1994 года пачаў працу першы клас дзяржаўнай Рыжскай беларускай пачатковай школы. З 1995 г. школа была прыпісана да 75-й рыжскай сярэдняй школы-гімназіі і знаходзілася на вул. Огрэс, 8.

Шмат намаганняў для арганізацыі і заснавання школы прыклаў у той час старшыня таварыства, супрацоўнік Латвійскай акадэміі навук, доктар хімічных навук Мікола Ярчак. Вялікую дапамогу і падтрымку мела школа і ад Амбасады Рэспублікі Беларусь у Латвіі і першага пасла Валянціна Вялічкі.

Пасля паспяховай акрэдытацыі ў 1998 г. школа атрымала статус Рыжскай Беларускай асноўнай школы.

З пачатку заснавання першага беларускага класа і да 2001 г. школу ўзначальваў Вячка Целеш. З 2001 года дырэктарам школы з'яўляецца магістр педагогікі і псіхалогіі, намеснік старшыні Рады таварыства "Сьвітанак" Ганна Іванэ.

Першымі настаўнікамі ў беларускіх школьнікаў таксама былі сябры "Сьвітанка" Тамара Станкевіч, Андрэй Гуцаў, Таццяна Касуха, Наталля Камілеўская.

У 2003 г. адбыўся першы выпуск школы. Цяпер у ёй навучаюцца дзеці з першага па дзевяты клас. У школе працуе моцны педагагічны калектыў, усе – спецыялісты з вышэйшай педагагічнай



Baltkrievu valodas stundu vada Rīgas baltkrievu svētdienas skolas skolotāja T. Stankeviča. 1993.g.
Урок беларускай мовы вядзе настаўніца Рыжскай беларускай нядзельнай школы Тамара Станкевіч. 1993. г.

адукацыяй.

Не губляе "Сьвітанак" сувязі са школай і ў цяперашні час, разам праводзяцца святы і імпрэзы. У школе працавалі і зараз працуюць настаўнікі – сябры "Сьвітанка": Анатоль Ермаковіч, Марыя Халяўская, Галіна Драчова, Святлана Каротчанкава, у складзе бацькоўскага камітэту – "сьвітанкаўцы" Таццяна Дробчык, Алена і Сяргей Рабацені і інш.

## АБ'ЯДНАННЕ МАСТАКОЎ-БЕЛАРУСАЎ БАЛТЫІ "МАЮ ГОНАР"

У 1991 г. у майстэрні мастака Вячкі Целеша ў Рызе па вул. Брывібас, 40 беларускімі мастакамі з Латвіі, Эстоніі, Літувы, Санкт-Петэрбурга было заснавана Аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар". Пазней у склад аб'яднання ўвайшлі мастакі і са Швецыі.



Apvienības "Maju gonar" jubilejas izstāde. 2001.g.
Мастакі аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар" на юбілейнай выставе. 2001 г.

Галоўнай задачай яго стала далучэнне да беларускага мастацтва сваіх суродзічаў, што жывуць у балтыйскіх дзяржавах, а таксама дапамога беларускім таварыствам гэтага рэгіёна ў адраджэнні сваей нацыянальнай культуры. З часу свайго заснавання і да сённяшняга дня аб'яднанне "Маю гонар" працуе пры Латвійскім таварыстве беларускай культуры "Сьвітанак".

Офіс "Маю гонар" знаходзіцца ў Рызе, у майстэрні яго старшыні Вячкі Целеша, у Рызе жыве і адказны сакратар аб'яднання Васіль Малышчыц, а наместнік старшыні – Маргарыта Астраумава жыве ў г.Іыхві ў Эстоніі. Суполкі аб'яднання працуюць у кожнай з вышэй пералічаных балтыйскіх дзяржаў, дзе ладзяць свае выставы і супрацоўнічаюць з мясцовымі беларускімі таварыствамі.

Агульныя выставы аб'яднання ладзіліся ў Латвіі, Эстоніі і Літуве, а да 1994 г. – і ў Беларусі. Апошняя выстава твораў жывапісу, графікі і прыкладнога мастацтва адбылася ў Рызе ў 2001 г. з нагоды дзесяцігадовага юбілею Аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар". Аб'яднанне паступова папаўняецца новымі мастакамі, усе разам яны нясуць жыхарам Балтыйскага рэгіёна свет радасці і прыгажосці.

## СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Дзеля гуртавання беларусаў і захавання сваёй індэнтычнасці латвійскім беларусам патрэбна аб'ектыўная інфармацыя на роднай мове. На жаль, сёння такой інфармацыі ў дастатковым аб'ёме мы не маем. Ёсць, праўда, міжнародныя беларускія радыёперадачы "Свабода" і "Палёнія", але па тэхнічных прычынах іх не заўсёды можна слухаць. Незалежную беларускую прэсу з Беларусі атрымаць складана, а інтэрнэтам не ўсе пакуль што маюць магчымасць карыстацца.

На працягу свайго існавання "Сьвітанак" увесь час супрацоўнічаў з рознымі сродкамі масавай інфармацыі дэмакратычнага накірунку як у Беларусі, так і ў Латвіі. Дзейнасць таварыства адлюстроўвалася і адлюстроўваецца на старонках газеты "Голас Радзімы", бюлетэня ЗБС "Бацькаўшчына" "Беларусы ў свеце", латышска- і расейскамоўнага друку, у праграмах Латвійскага дзяржаўнага радыё.




6."Svitanak" priekšsēdētājs Sergejs Kuzņecovs Černobiļas traģēdijas piemiņas 4. gadadiena. 1990.g.

Старшыня таварыства Сяргей Кузняцоў у дзень памяці 4-х угодкаў Чарнобыльскай трагедыі. 1990 г.

У часы латвійскай Атмоды газета г. Вентспілса "Вентас Балсс" вылучыла сваю старонку для беларусаў, у якой сябра "Сьвітанка" Уладзімір Скрабатун разам з журналісткай Аленай Нарушэвіч друкавалі самыя разнастайныя матэрыялы, што тычыліся беларускай гісторыі, культуры, змяшчалі, у прыватнасці, і інфармацыю пра дзейнасць "Сьвітанка".

Таварыства "Сьвітанак" спрабавала выдаваць сваю прэсу. Часткова была адноўлена газета "Голас беларуса", якую ў 20-30-х гадах выдавала ў Рызе беларускае таварыства "Бацькаўшчына" і яе рэдактар Кастусь Езавітаў. Сябра "Сьвітанка" Вадзім Паўловіч у 1989 г. выдаў чатыры нумары гэтай першай пасля савецкага часу беларускай газеты ў Латвіі. У 1997 г. пад рэдакцыяй Таццяны Касуха таварыствам быў выдадзены яшчэ адзін нумар "Голаса беларуса". Аднак і першая, і другая спробы працягваць выданне беларускай дэмакратычнай газеты з-за адсутнасці фінансавых сродкаў спыніліся.

У часы Адраджэння пад рэдакцыяй Сяржука Кузняцова і мастацкай рэдакцыяй Вячкі Целеша з дапамогай Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь таварыства выдала першы нумар часопіса "Сьвітанак", але і яго выданне з-за недахопу сродкаў было спынена.

Есць пэўныя здабыткі ў таварыства "Сьвітанак" і ў выдавецкай дзейнасці. У 1993 г. ім былі выдадзены паштоўкі з серыі "Слаўныя дзеячы беларускага адраджэння ў Латвіі" з партрэтамі Кастуся Езавітава і Сяргея Сахарава, а ў 1997 г. – з партрэтам Эдуарда Вайвадзіша. У 2002 г. да 120-годдзя Янкі Купалы была выдадзена паштоўка з рэпрадукцыяй карціны Вячкі Целеша "Дзьвіна-Даўгава – маці наша" (Янка Купала і Яніс Райніс). Істотную дапамогу ў арганізацыі выдання аказаў прадпрымальнік Янка Кабановіч.

У 1990 г. Латвійскім таварыствам беларускай культуры "Сьвітанак" пры падтрымцы Латвійскай дзяржавы на Латвійскім Радыё была заснавана беларуская грамадская культурна-асветніцкая праграма "Сьвітанак". Першым яе вядучым быў Сяргей Кузняцоў. З 1992 г. перадачу рыхтуе і вядзе журналістка, сябра "Сьвітанка" Таццяна Касуха. Змястоўна і цікава яна асвятляе ўсе навіны культурнага жыцця беларускіх суполак Рыгі, Даўгапілса, Ліепаі і Вентспілса, запрашае да сустрэч на радыёперадачы прадстаўнікоў гэтых таварыстваў.

З самага пачатку свайго існавання, дзякуючы самаадданай грамадскай працы яе стваральнікаў Сяргея Кузняцова і Таццяны Касуха, пры падтрымцы рэдактараў Латвійскага Радыё Лідзіі Чэры і Людмілы Корсак радыёпраграма "Сьвітанак" дапамагае слухачам інфармацыяй, родным словам, беларускай музыкай і песнямі жыць і працаваць на гэтай зямлі і адначасова адчуваць сябе беларусамі.

## БІБЛІЯТЭКА ТАВАРЫСТВА

Месцам, якое захоўвае крыніцы інфармацыі пра Беларусь, пра беларусаў Латвіі, іншых дзяржаў стала беларуская бібліятэка. Яна была заснавана "Сьвітанкам" пры падтрымцы Латвійскага рэспубліканскага прафсаюза ў 1990 г. на вул. Лачплеша, 43/45 пры бібліятэцы Клуба паліграфістаў. Бібліятэка была створана з кніг, якія ахвяравалі сябры таварыства, а таксама з беларускіх кніг, набытых таварыствам у рыжскай кнігарні "Драўдзіба" на грошы, што вылучыў "Сьвітанку" гэты прафсаюз.

Падчас, калі міністрам культуры Латвіі быў Раймонд Паўлс, па просьбе таварыства яго міністэрства выдаткавала грошы на падпіску для бібліятэкі амаль усёй папулярнай беларускай прэсы.

Шмат кніжак для бібліятэкі даслалі вядомыя беларускія пісьменнікі Беларусі Сяргей Панізнік, Адам Мальдзіс, Уладзімір Арлоў, Міхась Чарняўскі і Эрнэст Ялугін. У 1990 г. 90 беларускіх кніжак з творамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава, Івана Мележа і інш. даслаў у бібліятэку "Сьвітанка" Беларускі фонд культуры з Мінска. Пасля закрыцця ў 1991 г. у Клубе паліграфістаў бібліятэкі, беларуская бібліятэка пераехала ў памяшканне Рыжскай гарадской бібліятэкі № 4 па вул. Міера, 55/57. Зараз бібліятэка знаходзіцца ў офісе таварыства "Сьвітанак" па вул. Слокас, 37. У бібліятэцы ёсць прэса, якую дасылаюць з беларускіх дыяспар іншых краін.



Latviešu dzejnieks Andris Vējāns "Svitanakā" sveic Sergeju Panizniku ar 60-gadu jubileju. 2002.g.

Латышскі паэт Андрыс Веянс віншуе на вечарыне ў "Сьвітанку" Сяргея Панізніка з юбілеем. 2002 г.

Газету "Зважай" дасылаў яе рэдактар, пісьменнік Кастусь Акула з Канады, з ЗША газету "Беларус" дасылала Юзэфа Найдзюк, часопіс "Полацак" – Міхась Белямук,

дасылала Юзэфа Найдзюк, часопіс "Полацак" – Міхась Белямук, часопіс "Царкоўны пасланец" – Беларуская аўтакефальная царква, з Канады Раіса Жук-Грышкевіч рэгулярна дасылае Камунікаты Каардынацыйнага Камітэту беларусаў Канады.

З Беларусі бібліятэка пастаянна атрымлівае газету "Голас Радзімы", "Беларускую перспектыву" дасылае яе галоўны рэдактар Валянціна Трыгубовіч, бюлетэнь "Беларусы ў свеце" – МГА ЗБС "Бацькаўшчына". З Польшчы ў бібліятэку ў апошнія гады прыходзіць часопіс "Камунікат" ад Беларускай Рэдакцыі Радыё Палёнія.

## ПАДТРЫМКА ТАВАРЫСТВА

Уся дзейнасць таварыства "Сьвітанак" у асноўным грунтуецца на патрыятызме і самаахвярнай грамадскай працы яго сяброў. Але плённай ў сённяшняй сітуацыі яна б не была без падтрымкі з боку дзяржавы і асобных людзей.

Дзякуючы дапамозе Латвійскай дзяржавы, з 1992 г. таварыства мае свой офіс на вул. Слокас, 37, а таксама сваю бібліятэку, месца для сходаў, арганізацыі сваіх святаў і выстаў. Для сваёй працы і дзейнасці яно пастаянна атрымлівала хоць і не вялікую, але матэрыяльную падтрымку праз Міністэрства культуры, Міністэрства юстыцыі, а таксама праз Упраўленне натуралізацыі Дэпартамента грамадзянства і міграцыі Латвіі. Прадстаўнікі дзяржавы сваёй прысутнасцю на ўсіх імпрэзах і святах маральна і духоўна падтрымлівалі "Сьвітанак". Гэта саветнік прэзідэнта ЛР Ольгертс Тыпанс, кіраўнік Аддзела нацыянальных меншасцяў Міністэртва Юстыцыі Ілмарс Гейге і загадчыца Аддзела нацыянальных меншасцяў Упраўлення натуралізацыі Айна Балашка.



"Svitanak" biedrus desmitgadē sveic
Aina Balaško. 1998.g.
З дзесяцігадовым юбілеем сяброў "Сьвітанка"
віншуе Айна Балашка. 1998 г.

Падчас Адраджэння ў Беларусі "Сьвітанак" меў матэрыяльную і духоўную падтрымку і з боку Рэспублікі Беларусь праз міністэрствы і Беларускі фонд культуры, якім кіраваў пісьменнік Іван Чыгрынаў. Кантакты паміж таварыствам і беларускай дзяржавай адбываліся і ў латвійскім таварыстве ў Рызе, і ў Беларусі.

У 1990 г. падчас святкавання 500-х угодкаў Францішка Скарыны, якое ладзіў "Сьвітанак", яго наведала супрацоўніцтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ніна Загорская і навуковец Акадэміі Навук Беларусі Вячаслаў Чэмярыцкі.

У 1993 г. на сустрэчу ў таварыства прыехалі міністр замежных спраў РБ Пётр Краўчанка і міністр інфармацыі Беларусі Анатоль Бутэвіч. У гэтым жа годзе "Сьвітанак" наведалі намесніца міністра адукацыі РБ Людміла Сухнат і прадстаўніца Савета Міністраў Беларусі Наталля Голубева. Госцем таварыства


Biedrību jubilejā sveic Janka Kabanovičs. 1998.g.
З юбілеем "сьвітанкаўцаў" віншуе Я. Кабановіч. 1998 г.

прадстаўніца Савета Міністраў Беларусі Наталля Голубева. Госцем таварыства быў і пасол Рэспублікі Беларусь у Латвіі Валянцін Вялічка. Адбываліся неаднаразовыя сустрэчы світанкаўцаў з прадстаўнікамі беларускіх уладаў і ў Мінску ў час розных з'ездаў і канферэнцый. Некаторыя кантакты маюцца і цяпер.

Падтрымлівалі таварыства шмат асобных прыхільнікаў беларускага адраджэння, якія не з'яўляюцца сябрамі "Сьвітанка". Аднак найбольшую падтрымку беларускай культуры і асветы ў Латвіі, у тым ліку і культурнай дзейнасці "Світанка", унёс выпускнік Латвійскага палітэхнічнага інстытута прадпрымальнік Янка Кабановіч.

Таварыства "Сьвітанак" заўсёды мела сяброў з боку латышскага асяроддзя. Адна з іх – хабілітаваны доктар гістарычных навук, прафесар Ілга Апінэ, якая дапамагае ў даследаванні і папулярызацыі гісторыі беларускай дыяспары Латвіі, выдала грунтоўную кніжку "Беларусы ў Латвіі". Яна з'яўляецца сябрам ГА "Міжнародная асацыяцыя беларусістаў" і заўсёды разам са "Сьвітанкам" на яго святах і імпрэзах.

Вялікую справу на ніве латышска-беларускіх літаратурных сувязяў робіць перакладчыца і даследчыца латышскай і беларускай літаратур доктар філалогіі Мірдза Абала. Ёю створана вялікая і каштоўная праца па складанню беларуска-латышскага слоўніка. Мірдза Абала – сябра таварыства "Сьвітанак" і старшыня Латвійскай суполкі ГА "Міжнародная асацыяцыя беларусістаў."

Гасцямі "Сьвітанка" неаднаразова былі вядомыя латышскія пісьменнікі і журналісты Андрыс Веянс, Улдыс Берзіньш, Кнутс Скуеньекс, Эрыкс Хансбергс і інш.

## СТАСУНКІ

Таварыства "Сьвітанак" мае трывалыя сувязі з беларусамі Ліетувы і Эстоніі. Сябры таварыства прымаюць актыўны удзел у сумесных мерапрыемствах, прынамсі, дэлегаты ад "Сьвітанка" ўдзельнічалі ў працы 1-га, 2-га з'ездаў беларусаў Балтыі, у 2002 г. – у 3-й Канферэнцыі беларусаў Балтыі.

Суполка падтрымлівае кантакты з Радай Беларускай Народнай Рэспублікі і яе старшынёй Івонкай Сурвілай, з Каардынацыйным Камітэтам Беларусаў Канады, з Беларускім Інстытутам навукі і мастацтва ў ЗША, з беларускімі таварыствамі Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Польшчы, Санкт-Петэрбурга і Масквы. Не губляюцца сувязі і з Беларуссю. Таварыства з'яўляецца сябрам Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", яго дэлегаты ўдзельнічалі ў трох з'ездах беларусаў свету.



25. marta svētki "Svitanakā"( BTR 81. gadadiena )
No kreisās: Ilga Apine, Mirdza Ābola. 1999.g.

Свята 25-га сакавіка ў "Сьвітанку"
(81-я ўгодкі абвяшчэння БНР)
Злева-направа Ілга Апінэ, Мірдза Абола. 1999 г.

Сябрамі ГА "Міжнародная асацыяцыя беларусістаў" з'яўляюцца "сьвітанкаўцы" Мірдза Абала, Вячка Целеш, Валянціна Кліменка і Наталля Цімаховіч.

Удзельнікам Першай сустрэчы беларускай моладзі свету ў Мінску быў сябра таварыства Юрый Ярчак.

Супрацоўнічаў "Сьвітанак" і з нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Францішка Скарыны і яго заснавальнікам і першым дырэктарам, вядомым пісьменнікам, прафесарам Адамам Мальдзісам.

Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак" з'яўляецца сябрам Асацыяцыі нацыянальных культурных таварыстваў Латвіі (АНКТЛ), якая аб'яднала ў 1988 г. таварыствы дэмакратычнага накірунку, што падтрымліваюць незалежнасць Латвіі і сваё нацыянальнае культурнае адраджэнне.

У Асацыяцыю ўваходзяць больш дваццаці таварыстваў. АНКТЛ праводзіць вялікую працу на ніве развіцця, захавання і папулярызацыі розных нацыянальных культур Латвіі. Удзел Асацыяцыі і яе сябраў у сустрэчах з прадстаўнікамі вышэйшага кіраўніцтва Латвійскай Рэспублікі, у сустрэчах з прадстаўнікамі АБСЕ, ЕС і Амбасадаў розных краінаў, з прадстаўнікамі Фонда Сораса і іншых міжнародных арганізацый, а таксама ўдзел у міжнародных канферэнцыях і семінарах, у якіх удзельнічае і "Сьвітанак", сведчыць аб вялікім даверы да тых справаў, што робіць АНКТЛ.

Падчас прэзідэнства Гунціса Улманіса ў 1995 г. была створана Кансультатыўная Рада нацыянальнасцяў пры прэзідэнце Латвійскай Рэспублікі.У яе ўваходзілі вядомыя палітыкі, дзеячы культуры, прадстаўнікі нацыянальнасцяў Латвіі.

Прадстаўніком ад беларускай дыяспары ў кансультатыўнай Радзе з 1995 да 1996 г. быў Мікола Ярчак, а з 1996 да 1999 г. – Вячка Целеш. На пасяджэннях Рады, у якіх удзельнічалі прэзідэнт краіны і яго саветнік па нацыянальных пытаннях, разглядаліся законы дзяржавы па праблемах нацменшасцяў і іншыя пытанні. У 1999 г. з заканчэннем тэрміна прэзідэнцтва Г.Улманіса Кансультатыўная Рада спыніла сваю дзейнасць. Аднак не спынілася супрацоўніцтва са "Сьвітанкам" кіраўніка былой Кансультатыўнай Рады, цяперашняга саветніка прэзідэнта па нацыянальных пытаннях Олгерта Тыпанса.

## "СЬВІТАНАК" СЁННЯ

За час існавання "Сьвітанка" на яго пятнаццацігадовым шляху былі розныя перыяды. Сёння відавочна – суполка аказалася трывалай, жыццядзейнай арганізацыяй, здольнай пераадольваць аб'ектыўныя цяжкасці, развівацца і расці.



Rīgas baltkrievu svētdienas skolas beidzēji
N. Koscina un J.Jarčaks atklāj svētkus,
kas veltīti Kastusja Jezavitava 100-gadei
un "Svitanak" 5-gadei. 1993. g.

Выпускнікі рыжскай беларускай нядзельнай школы Н. Косціна і Ю. Ярчак адчыняюць свята, прысвечанае 100-годдзю Канстанціна Езавітава і 5-годдзю "Сьвітанка". 1993 г.

У 1999 г. старшынёй "Сьвітанка" была абрана Таццяна Казак. Дзякуючы сваім арганізатарскім здольнасцям і энергіі, яна здолела надаць новы імпульс у працы таварыства. З прыходам у суполку новых сяброў, моладзі, творчай інтэлігенцыі больш плённымі сталі яе мерапрыемствы. Ў апошнія гады "Сьвітанак" збірае на свае святы і імпрэзы поўныя залі.

Штогод таварыства ладзіць святы, якія сталі ўжо традыцыйнымі – Калядкі, Вялікдзень, ўгодкі абвяшчэння незалежнай Беларускай Народнай Рэспулікі, адзначае векапомныя даты і юбілеі. Істотнай рысай гэтых мерапрыемстваў стала тая акалічнасць, што да ўдзелу ў іх запрашаюцца не толькі беларускія суполкі, але і розныя грамадскія аб'яднанні.

Цікава і змястоўна ў 2002 г. у "Сьвітанку" быў адсвяткаваны 60-гадовы юбілей аднаго з арганізатараў таварыства, беларускага паэта, публіцыста і перакладчыка, кавалера Ордэна Трох Зорак Латвіі Сяргея Панізніка. У ім удзельнічалі прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Латвіі Андрыс Веянс, Улдыс Берзіньш, Эрыкс Ханбергс і Валдыс Румніекс, а таксама старшыня Рускага культурнага цэнтра "Улей" паэт і пісьменнік Сяргей Жураўлёў.

Урачыстае адкрыццё выставы, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння беларускага мастака з Латгаліі Пётры Мірановіча, было арганізавана таварыствам беларускай культуры "Сьвітанак" сумесна з Аб'яднаннем мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар". Апрача беларускіх, у выставе ўзялі ўдзел мастакі іншых нацыянальнасцяў – прадстаўнікі суполак, якія ўваходзяць ў Асацыяцыю нацыянальна-культурных таварystваў Латвіі.

Вялікім літаратурна-музычным святам адзначыў "Сьвітанак" разам з калектывам Рыжскай беларускай асноўнай школы 120-гадовы юбілей Янкі Купалы і Якуба Коласа. Акрамя вершаў і песень на словы нашых



Sergejs Paņizņiks Mihasja Galinskaga izstādes atklāšanā, mākslinieka meitai Aleksandrai Sļivinai - dzejnieka grāmata. 2002.g.

Паэт Сяргей Панізнік на адкрыцці выставы Міхася Галынскага дорыць дачцы мастака Аляксандры Слівінай сваю кнігу. 2002 г.



Mākslas izstādes atklāšana, kas veltīta gleznotāja Pētera Miranovič45.a simtgadei. 2002.g.
Адкрыццё выставы, прысвечанай 100-м угодкам мастака Пётры Міpановіча. 2002 г.

славутых класікаў, твораў, прысвечаных ім, на беларускай мове, на вечарыне прагучалі пераклады паэзіі Купалы і Коласа на латышскую мову. Шаноўнымі гасцямі на вечарыне былі латышскія паэты і перакладчыкі Андрыс Веянс і Кнутс Скуеныекс. А. Веянс расказаў аб асабістых сустрэчах з Якубам Коласам, а К. Скуеныекс прачытаў свой пераклад на латышскую мову верша "А хто там ідзе" ("Bet kas tur nāk")

Пазнаёміцца з творчасцю беларускага мастака з Ліепаі Міхася Галынскага рыжане змаглі дзякуючы сумесным намаганням "Сьвітанка", дачкі мастака Аляксандры Слівінай і ліепайскай беларускай суполкі "Мара". Прыемным падарункам аматарам мастацтва стала персанальная выстава, на ўрачыстае адкрыццё якой прыйшлі не толькі беларусы, але і прадстаўнікі латышскай творчай інтэлігенцыі, з якімі таварыства падтрымлівае цесныя стасункі. Прыемна, што з кожным годам яны паступова пашыраюцца. Так, сёлета таварыства "Сьвітанак" у самым цэнтры Старой Рыгі – Доме Менцэндорфа ладзіла Дзень беларускай культуры. Ініцыятарамі гэтага мерапрыемства выступілі самі гаспадары, супрацоўнікі гэтага дома-музею. Цікавасць гасцей свята выклікалі выставы, падрыхтаваныя "сьвітанкаўцамі" – экспазіцыя беларускіх кніг і выстава вырабаў беларускіх майстроў, а таксама дэманстрацыя прыгатавання страў беларускай кухні і вялікі канцэрт. Дзень беларускай культуры ў Доме Менцэндорфа адбыўся ў красавіку, а ўжо ў ліпені бягучага года падобнае свята ладзілася ў музеі "Кіпі" ў Добельскім раёне Латвіі.

Цікавыя кантакты наладжваюцца ў таварыства і з калектывам Балтыйскага Рускага інстытута. Сябры таварыства разам з мастакамі аб'яднання "Маю гонар" прынялі дзейсны ўдзел у вечарыне беларускай культуры, якую ладзілі студэнты ў рамках праекта "Сусветная культура і міжнародныя культурныя адносіны". А ў 2003 г. у памяшканні Рускага Балтыйскага інстытута таварыства арганізавала для беларусаў Рыгі вялікае святкаванне 85-х угодкаў БНР. На ім, акрамя мясцовых беларускіх мастацкіх калектываў, гасцей свята сваёй музыкай і песнямі парадаваў вядомы беларускі эстрадны гурт "Прымакі" з Беласточчыны, запрошаны таварыствам. У гэты дзень падчас свята была адчынена таксама выстава мастакоў з аб'яднання "Маю гонар".

Працягваюцца стасункі ЛТБК "Сьвітанак" і з беларускімі суполкамі Латвіі. Яны – жаданыя госці ў таварыстве, праводзяцца і супольныя мерапрыемствы. Так, у святах "Сьвітанка" неаднаразова ўдзельнічаў прадстаўнік таварыства беларускай культуры "Уздым" з Даўгапілса, паэт Станіслаў Валодзька, на імпрэзах "Уздыма" бывалі і "сьвітанкаўцы". Разам з беларускай суполкай "Спадчына" таварыства ладзіла канцэрт ансамбля "Прымакі" ў Вентспілсе.

З прыходам у таварыства новых сяброў, а найперш Таісіі Бачкаровай, Людмілы Кароль, Людмілы і Лаўры Ігнатавых, Яраслава і Аляксандры Ларыёнавых, Анатоля Ермаковіча, а таксама з дапамогаю ветэранаў "Сьвітанка", сябраў Рады Наталлі Камілеўскай, Станіслава Клімава, Таццяны Казак і Таццяны Дробчык здзейснілася даўняя задума "Сьвітанка" – у 2002 г. быў створаны ўласны гурт беларускай песні "Сьвітанак". Пад прафесійным кіраўніцтвам спявачкі Аляксандры Ларыёнавай і піяністкі-акампаніятара, выпускніцы Беларускай кансерваторыі Людмілы Кароль, ён з кожным сваім выступленнем набывае ўсё большае майстэрства, без яго ўдзелу цяжка ўявіць любое свята таварыства. Гурт таксама бярэ ўдзел у канцэртах, якія ладзіць Асацыяцыя нацыянальных культурных таварystваў Латвіі. Прыйшло да калектыву і першае прызнанне – гурт "Сьвітанак" адзначаны дыпломам "За высокае прафесійнае майстэрства" на фестывалі "Даўгавас вайнагс" 1 мая 2003 года.

Актыўны ўдзел бярэ ЛТБК "Сьвітанак" і ў шматлікіх міжнародных і мясцовых канферэнцыях, пасяджэннях, семінарах і сустрэчах па пытаннях праблемаў нацменшасцяў, грамадскай інтэграцыі, уваходу Латвіі ў Еўразвяз і інш.

У далейшым Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак" бачыць неабходным захоўваць і развіваць культуру беларусаў у Латвіі як частку сусветнай культуры, існаванне якой немагчыма без шматлікасці розных культур і кантактаў паміж імі, а таксама падтрымліваць палітыку Латвійскай дзяржавы ў галіне інтэграцыі нацыянальных культур.



Tautību Konsultatīva Padome ar Prezidentu Gunti Ulmani. 1999.g.
Кансультатыўная Рада па нацыянальных пытаннях з Прэзідэнтам Латвіі Г. Ульманісам. 1999 г.



Ansambļa "Svitanak" solisti
Aleksandra un Jaroslavs Larionovi

Салісты гурта "Сьвітанак"
Аляксандра і Яраслаў Ларыёнавы



"Svitanaku" ar 10-gadi sveic Rīgas baltkrievu pamatskolas ansamblis "Vavjoračka". 1998.g.

З 10-годдзем "Сьвітанак" віншуе ансамбль "Вавёрачка" Рыжскай Беларускай асноўнай школы. 1998 г.



Rīgas baltkrievu pamatskolas ansamblis "Vavjoračka". 2002.g.

Ансамбль "Вавёрачка" Рыжскай Беларускай асноўнай школы. 2002 г.




BTR proklamēšanas 85. gadadiena Rīgā. Svētku koncerta dalībnieki kopā ar viesiem - baltkrievu ansambli "Primaki" no Polijas. 2003.g.

85-я ўгодкі абвяшчэння БНР у Рызе. Удзельнікі святочнага канцэрту разам з гасцямі - беларускім гуртам "Прымакі" з Польшчы. 2003 г.

